ту № 1, вакуумнасосная, вусы перагрузы ...

КРАЕВЕДЧЕСКИЙ СОЛИГОРСКА



Лепшыя мантажнікі БУ-89 Мікалай Ярашэвіч, Міхаіл Славашэвіч і Васіль Бялько на мантажы галоўнага корпуса абагачальнай фабрыкі Салігорскага калійнага камбіната.

Фота В. Дубінкі.

«БУДАЎНІК КАМУНІЗМА»
2 стар. 7 лістапада 1963 г.

# ЭНТУЗІЯСТЫ

Салігорск святочны. Яшчэ больш стала ў ім яркіх агнёў, прыўмножылася і працоўная слава будаўнікоў і гарнякоў. Слаўна папрацавалі яны ў перадкастрычніцкія дні, аб іх поспехах ведае ўся рэспубліка.

Вось брыгада муляраў Далматовіча. Усе члены яе выдатна папрацавалі на ўзвядзенні сцен абагачальнай фабрыкі — цэнтральнага аб'екта калійнага камбіната. Цяпер, побач з шахтавымі капрамі, узвышаецца яе адзінаццаціпавярховы корпус. Брыгада заваявала ганаровае права камуністычнай, закончыла кладку сцен апошняга пралёта. Муляры Тубальцоў, Хацкевіч, Зарэцкі і іншыя выконвалі па два зменныя заданні.

Добрая слава надзейна ўмацавалася за камсамольска-маладзёжнай брыгадай тав. Нікіценкі. Яна датэрмінова завяршыла свой участак кладкі сцен. Мантажнікі з брыгады Пасекава паспяхова ўстанаўлівалі тэхналагічнае абсталяванне. Складаным быў і працэс устаноўкі металаканструкцый корпуса фабрыкі, але з гэтай работай паспяхова справіліся людзі з брыгады Раманоўскага.

Выдатны падарунак Радзіме падрыхтавалі і гарнякі руднікова двара калійнага камбіната. 5 лістапада яны ўрачыста рапартавалі аб заканчэнні выканання гадавога плана выдачы сільвініту.

Поспех гэты, вядома, сам па сабе не прыйшоў. Ён дасягнут напружанай і зладжанай працай усяго калектыву. Старанна папрацавалі змены горнапраходчых камбайнаў, якімі кіруюць Мацюшын, Шалыгін, Булгак і іншыя.

Ёсць аб чым рапартаваць і праходчыкам другога калійнага камбіната. Лепшых паказчыкаў у працы тут дабілася комплексная брыгада Анатоля Сіліванава. Напярэдадні кастрычніцкіх свят яна дасягнула глыбіні першага шахтавага ствала 460 метраў. Гарнякі дабіліся скорасці праходкі 43 пагонных метраў ствала за месяц.

Куды ні паглядзіш, усюды працуюць энтузіясты будоўлі вялікай хіміі.

У. МАКСІМАЎ.